# СЛОВА ПРА МАЦІ, ЖОНКУ, КАЛЕГУ, НАСТАЎНІКА

***Г. А. Антанюк,***
*доктар філасофскіх навук, прафесар*

## ЖОНКА, СЯБАР, ПАРТНЁР І ПАПЛЕЧНІК

Я пазнаёміўся з Любай восенню 1970 г.у аспірантуры Акадэміі навук БССР. Яна вучылася ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, а я – у аспірантуры Інстытута філасофіі і права. Праз год восенню мы з Любай ажаніліся і жылі ў інтэрнаце на вуліцы Акадэмічнай. Мы святкавалі наша вяселле ў інтэрнаце, а пасля на Усходнім Палессі ў вёсцы Буда Хойніцкага раёна, дзе жыла маці Любы Праскоўя Іванаўна Бендэга, і на Заходнім Палессі ў вёсцы Мацы Кобрынскага раёна, дзе жылі мае бацькі Аляксандр Барысавіч і Надзея Данілаўна Антанюкі. Праз год восенню 1972 г.у нас нарадзілася першая дачка – Надзея, потым зімой 1977 г. другая дачка – Марына, а зімой 1989 г. – сын Аляксандр.



Любоў Адамаўна, Георгій Аляксандравіч і дачка Надзея. Мінск, 1976 г.

Любе пашанцавала, што яе навуковым кіраўніком у аспірантуры Інстытута мовазнаўства быў выдатны мовазнавец Арнольд Яфімавіч Міхневіч.



Любоў Адамаўна і Арнольд Яфімавіч Міхневіч на навуковай канферэнцыі.
1980-я гг.

Хаця пэўны час Люба была ў дэкрэтным адпачынку, аднак змагла напісаць і паспяхова абараніць у 1974 г. кандыдацкую дысертацыю, на аснове якой выдала сваю першую манаграфію. Гэта, напэўна, быў адзін з самых спакойных перыядаў навуковай дзейнасці Любы. Пазней, калі яна выбрала для даследавання новы напрамак сваёй навуковай дзейнасці, звязаны з праблемамі беларускай тэрміналогіі, ёй даводзілася, кажучы фігуральна, з боем адстойваць свае навуковыя ідэі. І ў гэтым наш навуковы лёс быў падобным, хоць я сацыёлаг і філосаф. У Любы быў вялікі навуковы патэнцыял і значная сіла волі, дзякуючы чаму яна дасягнула свае навуковыя мэты і гэтым унесла вялікі навуковы ўклад у развіццё беларускага мовазнаўства, найперш тэрміназнаўства. Любоў Адамаўна выдала першую ў Беларусі манаграфію па беларускай навуковай тэрміналогіі, абараніла першую ў Беларусі доктарскую дысертацыю ў гэтай галіне (1992 г.), напісала вялікую колькасць арыгінальных навуковых артыкулаў па праблемах тэрміналогіі, а таксама распрацавала шмат вучэбных матэрыялаў падчас педагагічнай працы ў Беларускім

дзяржаўным універсітэце, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншых вышэйшых навучальных установах г. Мінска. У яе была вялікая схільнасць да педагагічнай дзейнасці, якую яна актыўна рэалізоўвала.

Люба творча адносілася да выкарыстання новых ідэй і метадалагічных падыходаў у даследаванні мовы. Напрыклад, я прафесійна займаўся метадалогіяй сацыяльнага праектавання, абараніў па гэтай праблеме доктарскую дысертацыю і расказваў Любе пра навуковыя дасягненні ў галіне даследавання праектавання як інтэлектуальнай дзейнасці, а яна творча выкарыстоўвала гэта для даследавання магчымасцей і асаблівасцей прымянення праектавання ў тэрміналогіі.

Характэрнай рысай Любы быў альтруізм. Яна ахвотна дапамагала не толькі маім бацькам і сваёй маці, але і чужым людзям.



Любоў Адамаўна садзіць бульбу. Заходняе Палессе, вёска Мацы, 1975 г.

Люба была вельмі самадастатковай і старалася не ўцягваць блізкіх у асабістыя праблемы. Аднак, калі яна мела патрэбу ў падтрымцы, то мы, члены яе сям'і, усімі сіламі стараліся ёй дапамагчы. У нас з Любай была роднасць у сацыяльным паходжанні, прафесійным шляху, навуковым лёсе, інтэлекце, а таксама ў агульнасацыяльных, светапоглядных і бытавых каштоўнасцях. Я і дзеці шчыра любілі Любу, і мы заўсёды памятаем пра яе!